Источник: “Звязда” – 2019-12-04

# Нашы – на Паўднёвым полюсе Зямлі



Беларускія палярнікі распачалі навуковыя даследаванні ў Антарктыдзе

Пра гэта Прэзідыум НАН Беларусі праінфармаваў начальнік 12-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі (12-я БАЭ) Аляксей Гайдашоў.

Супрацоўнікамі ўжо выкананы шэраг работ. Так, у рамках навуковай праграмы па даследаванні змяненняў прыроднага асяроддзя і клімату Зямлі Эндэрбі пад уплывам антрапагенных і прыродных фактараў разгорнута метэаралагічная станцыя М-49М. Распачалася рэгулярная перадача метэазвестак на замежныя антарктычныя станцыі, а таксама ў Міжнародны Антарктычны лагістычны цэнтр у Кейптаўне для забеспячэння ўнутрыантарктычных палётаў авіяцыі. Абсталяваны снегамерны пост, распачата назіранне за вышынёй снежнага покрыва.

У лабараторыі фізікі атмасферы разгорнуты пункт азонаметрычных назіранняў. З выкарыстаннем распрацоўкі Інстытута фізікі НАН Беларусі на трох палігонах праведзены серыі вымярэнняў спектраў адлюстравання розных тыпаў падсцілаючай паверхні. У рамках біялагічнай праграмы выкананы выхад на лёд бухты Лазурная - праведзены адлоў узораў іхціфаўны (35 асобнікаў).

Удзельнікамі 12-й БАЭ праведзены комплекс работ па далейшым разгортванні сістэм жыццезабеспячэння. Асабісты склад здаровы. У калектыве падтрымліваецца роўны маральна-псіхалагічны клімат, арганізацыя работ і даследаванняў нацэлена на вынік. Прыборы для навуковых назіранняў, сістэмы жыццезабеспячэння, сродкі транспарту і сувязі працуюць у штатным рэжыме. На Беларускай антарктычнай станцыі маюцца неабходныя запасы паліва, прадуктаў харчавання, медыкаментаў. З расійскімі станцыямі “Прагрэс”, “Новалазараўская”, палявой базай “Маладзёжная” і бортам НЭС "Акадэмік Трэшнікаў" падтрымліваецца ўстойлівая спадарожнікавая, УКХ- і КХ-сувязь.

Над Беларускай антарктычнай станцыяй у гонар адкрыцця 12-га антарктычнага сезона узняты дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь і сцяг Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Дванаццатая беларуская антарктычная экспедыцыя накіравалася на ледзяны кантынент 8 лістапада. Упершыню ў яе складзе на Паўднёвы Полюс Зямлі адправіліся адразу дзесяць беларусаў. Сярод іх ёсць як бывалыя палярнікі (іх роўна палова), так і навічкі. Палярнікам трэба будзе не толькі прадоўжыць нарошчванне інфраструктуры першай чаргі станцыі Беларускай антарктычнай экспедыцыі, але і правесці вялікі комплекс навуковых даследаванняў.